**Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя беларускай літаратуры XI–XVII стст.»**

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята (агульная вышэйшая адукацыя)<br>Спецыяльнасць: 6-05-0232-01 Беларуская філалогія<br>Цыкл спецыяльных дысцыплін: дзяржаўны кампанент<br>Модуль «Гісторыя беларускай літаратуры» |
| **Кароткі змест** | Старажытная літаратура. Перыядызацыя. Перакладная і арыгінальная літаратура. Праблематыка і жанравая спецыфіка літаратуры ўсходніх славян. Станаўленне ўласнабеларускай літаратуры. Летапісы і хронікі часоў ВКЛ. Беларускі Рэнесанс і яго прадстаўнікі. Літаратура перыяду Рэфармацыі і Контррэфармацыі. Літаратура XVII–XVIII стст. Барока, класіцызм, асветніцтва ў Беларусі. Палемічная літаратура. Сілабічная паэзія. Драматургія. Станаўленне тэатра. Школьны, прыдворны, аматарскі і народны тэатры ў Беларусі. Батлейка. Гісторыка-мемуарная проза. Летапісанне. |
| **Фарміруемыя кампетэнцыі, вынікі навучання** | У выніку паспяховага засваення дысцыпліны студэнт павінен: ***ведаць***: асаблівасці літаратурнага працэсу ў Беларусі ў XI-XVII стст.; літаратурныя напрамкі, плыні, мастацкія метады;праблематыку, ідэйны змест, асаблівасці кампазіцыі і вобразна-выяўленчыя сродкі; жанры і стылі літаратуры XI-XVII стст.; творчую гісторыю найбольш значных мастацкіх тэкстаў; літаратуразнаўчыя працы, прысвечаныя гіст. бел. літ. XI-XVII стст.; нацыянальнае і агульначалавечае значэнне мастацкіх твораў; павінен ***умець***: выкарыстоўваць навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных праблем; фарміраваць і вырашаць задачы, якія ўзнікаюць у час навукова-даследчай дзейнасці; карыстацца міждысцыплінарнымі падыходамі пры вырашэнні праблем; выбіраць неабходныя метады даследавання; дыялектычна мысліць, аргументаваць свой пункт гледжання; аналізаваць твор з улікам яго ідэйна-мастацкай цэласнасці ў гісторыка-літаратурным кантэксце; сістэматызаваць і абагульняць фактычны матэрыял, які адлюстроўвае асаблівасці літаратуры розных гістарычных перыядаў; выяўляць аб'ектыўныя заканамернасці і асаблівасці развіцця літаратурнага працэсу; характарызаваць літаратурны напрамак, літаратурны этап; выкарыстоўваць тэарэтычныя веды для вывучэння канкрэтных мастацкіх твораў; працаваць з навукова-крытычнай і даведачнай літаратурай. Вывучэнне дысцыпліны павінна збяспечыць фарміраванне ў спецыяліста **кампетэнцыі** БПК-10-12. Характарызаваць розныя этапы развіцця бел. літ., яе асноўныя напрамкі, плыні і мастацкія метады; характарызаваць мастацкі тэкст з пункту гледжання яго аўтарства і суаднесенасці з літаратурным кірункам, школай, працаваць з тэкстам мастацкага твора на аснове методык аналізу і інтэрпрэтацыі; выяўляць і аналізаваць філасофскія, рэлігійныя, гісторыка-культурныя, палітычныя і іншыя ідэі і канцэпцыі, што знайшлі мастацкае ўвасабленне ў творах беларускай літаратуры. |
| **Прэрэквізіты** | Вусная народная творчасць. Уводзіны ў літаратуразнаўства. Гісторыя рускай літаратуры. |
| **Працаёмкасць** | 3 заліковыя адзінк, 120 акадэмічных гадзін, з іх з іх 64 аўдыторных: 40 гадз. лекцый і 24 гадз. практычных заняткаў |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы атэстацыі** | 1 семестр, калоквіум, тэст, экзамен |